УДК 821.161.3.09

# САКРАЛІЗАЦЫЯ ВОБРАЗА МАЦІ Ў АПОВЕСЦЯХ І. ШАМЯКІНА "ПАЛЕСКАЯ МАДОННА" І "СЛАЎСЯ, МАРЫЯ!"

Л.Г. ДУКТАВА, канд. філал. навук, дацэнт
УА "Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А. Куляшова"
г. Магілеў, Рэспубліка Беларусь

Мастацкі свет літаратурных твораў І. Шамякіна напрыканцы мінулага стагоддзя багаты на разнастайных персанажаў. Яскрывым вобразам-сімвалам, які фігуруе ў творах розных гадоў І. Шамякіна з'яўляецца вобраз маці. Гэта Поля Шугачова з "Атлантаў і карыядытаў", Саша Траянава з "Трывожнага шчасця", Вольга Пыльчанка са "Злой зоркі", Надзея Русак з "Палескай мадонны", Галіна Вятрэнка з "Зоны павышанай радыяцыі", Марыя Шамякіна з аповесці "Слаўся, Марыя" і інш. Гэты каштоўны вобраз не маглі абысці ўвагай даследчыкі творчай біяграфіі пісьменніка. Аналізуючы жаночыя вобразы ў прозе І. Шамякіна, Д. Бугаёў звярнуў увагу на іх прататыпы. Даследчык распавядае пра двух жанчын, якія натхнілі пісьменніка на стварэнне шматграннага вобраза маці. Гэта Сынклета Іванаўна Шамякіна і Марыя Філатаўна Шамякіна (Кротава).

Вяршыняй матчынай любові і шанавання з'яўляецца вобраз Мадонны ў хрысціянскім грамадстве. У аповесці "Палеская мадонна", створанай ў 1996 г., пісьменнік ідэалізуе вобраз беларускай маці. За яе любоў да дзяцей, клопат пра іх майстра выццам не заўважае астатніх (часам і не самых лепшых) рыс характару, учынкаў галоўнай гераіні – Надзеі Русак.

Усе яе думкі і клопаты заняты дзецьмі: "Во мужчына, не тое што бацька яго [пра сына Арцёмку. – Л.Д.]. Во шчасце нейкай расце. Сыночак мой родненькі, радасць мая! Ды ўсе вы радасць. Задумлівая Маша... Дачушка мая, не трэба так рана сур'ёзна задумвацца. Вучыся – і ўсё. А пра ўсё іншае я пакуль што буду думаць. І рагатуха, ласунок Юлька. Ёй абы было што паесці. Уся ў бацьку. Але ж хіба я менш цябе люблю? Не менш. Ну, Юрачка... Дык Юрачка ж маленькі, што вы хочаце з яго! – апраўдвалася перад астатнімі дзецьмі за асаблівую любоў да малодшага сынка. – Я і вас так гушкала, калі вы былі, як Юрачка" [5, с. 29].

"Чым накарміць дзяцей?" Рэфрэнам гучаць гэтыя словы праз усю аповесць. Здаецца, гэта галоўнае пытанне, якое турбуе Надзею Русак штодзённа. Пра гэта сведчаць першыя радкі аповесці: "Надзею разбудзіў першы певень. <...> Не адразу адляцелі ўявы таго, што яна бачыла ў сне. А бачыла яна харч – гару харчу: мяса, сала, смятану, цыбулю, капусту... Пакутлівы сон. Здавалася б: што страшнага ў тым,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

што сніш такое багацце? А страшнае тое, што ў доме пуста і галава забіта аднымі думкамі: чым накарміць дзяцей" [5, с. 6]. Параўнаем гэты ўрывак з тым, які змешчаны ў фінале твора: "Чым накарміць дзяцей – пра гэта не думала: генерал даў ёй адно дзвесце тысяч; двое міліцыянераў садзілі яе ў вагон, як прэзідэнтшу. Думала пра чужое дзіця, якое засталося ў міліцыі. На развітанне спытала: " А Светку куды?" "Светку, відаць, прыйдзецца ў дзетдом…" "Аддайце яе мне" [5, с. 101].

У аповесці адчуваюцца спагадлівыя адносіны пісьменніка да гераіні. Разам з тым, празаік у канву твора ўключае факты, якія сведчаць пра тое, што вобраз гэтай жанчыны зусім не ідэальны. Дзеля таго, каб накарміць дзяцей яна здатнае на многае, нават на крадзёж. Хоць аўтар і вядзе гутарку пра гэта мімаходзь, быццам не звяртаючы сур'ёзнай увагі на такія ўчынкі. Але самае галоўнае, што і гераіня апраўдвае сябе – гэта ж дзеля дзяцей яна магла дазволіць сабе ўзяць не просячы толькі малако ў дзяржавы ("Раней яна, навучаная запавету: "Не крадзі!", малачко ўсё-такі дзеткам прыносіла – ад цялят. У грэлцы насіла, падвязаўшы яе на жывот, прывыклі людзі да яе круглага жывата. Прынеслаб і цяпер – Бог з ім, з запаветам, для дзяцей не грэх!" [2, с. 8]), толькі грошы ў мужа ("Рэдка Надзя залазіла ў мужавы кішэні, хіба да п'янага. А тут праверыла ўнутраную кішэню ў куртцы. <…>Дастала грошы, раздзяліла шчодра: сабе ўзяла тры купюры, яму – чатыры. Палажыла яго частку ў кішэню. Але тут жа перадумала, дастала з яго долі адну купюру, далучыла да сваёй, схавала за пазуху. Уздыхнула, быццам пашкадавала, што сем нельга раздзяліць пароўну. Але ж іх тут пяцёра, а ён адзін!" [2, с. 43–44]), толькі прадукты ў суседкі ("Надзя стала на калені, у крапіву, прасунула галаву ў дзірку, заглянула за "мяжу", што раздзяляла суседнія "дзяржавы", і ў кусцее маліны ўбачыла… яйка. Ажно ногі памлелі, сэрца закалацілася. Ніколі не брала чужога. Але ж для Юрачкі… Для Юрачкі! Працягнула руку, схапіла яйка, цёплае яшчэ" [2, с. 12]). І тут паказаны другі бок Надзеі Русак. Але самае галоўнае, што аўтар, прэзентуючы гераіню ў такім ракурсе, імкнецца хутчэй не асудзіць, а апраўдаць жанчыну, для якой няма чым накарміць дзяцей.

Параўноўваючы вобраз маці ў аповесці "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел" В. Казько з вобразам маці ў творы "Палеская мадонна" І. Шамякіна, Н. Давыдоўская адначае: "Гераіня І. Шамякіна існуе ў свеце, які ёй хоць і не падабаецца, аднак з'яўляецца цалкам зразумелым. "Палеская мадонна" прачытваецца ў кантэксце беларускай савецкай традыцыі разумення "вечнага" вобраза, якая акцэнтуе ўвагу на мацярынстве, зямным абліччы Мадонны. Вобраз жа галоўнай гераіні В. Казько Дзевы Марыі падкрэслена шматзначны, ускладнены рознымі культурнымі кантэкстамі. З аднаго боку, ён актуалізуе традыцыйныя

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

біблейскія і раннехрысціянскія сэнсы, з другога – язычніцкі дахрысціянскі пласт архетыпу Маці. Аднак галоўнае адрозненне паміж двума мадоннамі палягае ў тым, што трагедыя гераіні В. Казько пачынаецца там, дзе для гераіні І. Шамякіна яна заканчваецца" [3, с. 29].

Дзіця для Надзеі Русак – найвялікшая каштоўнасць. Дзеля яго маці можа пайсці на многае. Яна шмат працуе, хоць не атрымлівае ўжо чацвёрты месяц зарплаты. Жадаючы выратаваць сваіх дзяцей ад голаду, не знайшоўшы падтрымкі ні ў мужа, ні ў мясцовага кіраўніцтва, Надзея едзе са сваёй просьбай-скаргай у сталіцу, шукае сустрэчы з Прэзідэнтам.

Як найвышэйшуюрадасць успрымае дзяцей і Марыя Шамякіна з аўтабіяграфічнай аповесці "Слаўся, Марыя!": "Дзеці – шчасце сям'і. Не нараджаць Маша не магла" [6, с. 81]. У Шамякіных нарадзілася трое дочак і сын. Да іх, як і да любімага мужа, яна таксама адносілася самаахвярна: "Дзеля дзяцей, унукаў магла стаяць у чэргах гадзінамі" [6, с. 96].

У творы мажорныя ноты дамінуюць пры апісанні сітуацыі, калі дзіця нараджаецца ("З Дуная мы прывезлі дунайку – Алесю. Яна нарадзілася 16 чэрвеня 1961 г. Трэцяя дачка! Чацвёртая радасць" [6, с. 81].), расце ("Дзяцей Маша песціла больш, чым трэба. Ні ў чым не адмаўляла ім" [6, с. 85]). І, наадварот, пры апісанні страты дзіцяці прысутнічаюць толькі мінорныя ноты. Напрыклад, калі гутарка ідзе пра аборт, які Марыя ўспрымае як найвялікшы свой грэх: "Ты не ўяўляеш, які гэта жах. Не фізічны – маральны. Каб ведала, ніколі не пайшла б на гэта. Я сню дзіцятка, якое забіла. Ад гэтага можна звар'яцець. <…> Я знаю, за што мяне Бог карае. <…> Грэх на мне адзін" [6, с. 81–82]. Пасля таго, як памёр яе сын Саша, жыццё стала бязрадасным, амаль беспрасветным: "Пасля свет страціў свае фарбы, акрамя чорнай. У такім змрочным свеце дарагая мая жонка, маці нашых дзяцей, бабуля ўнукаў, пражыла без малога сем гадоў. Пакутнае жыццё!" [6, с. 97].

Вобраз Марыі Шамякінай з'яўляецца таксама сімвалам вернасці, адданасці чалавеку, з якім разам можна прайсці праз жыццё (у шлюбе пражылі 58 гадоў). Даўжыню гэтага дружнага саюзу, шчасце жыцця разам Шамякін тлумачыць імкненнем да цнатлівасці ва ўсіх адносінах: "Прачытаў у Талстога: "Для того, чтобы был честный брак, нужно стремление к полному целомудрию". Вельмі слушна. <…> Я глыбока перажываю, што ўнукі мае, захопленыя сучаснай нізкаякаснай літаратурай, пошлым кіно, не разумеюць магічнай сілы класікі. А ёсць жа і ў іх прыродная цнатлівасць – ад бабулі, ад маці!" [6, с. 30].

Такім чынам, у аповесцях "Палеская мадонна" і "Слаўся, Марыя!" паказаны архетыпны вобраз маці. Для Надзеі Русак і Марыі Шамякінай дзеці з'яўляюцца сэнсам жыцця. У гэтых творах пісьменнік стварае вобраз маці, надзеленай якасцямі беларускай жанчыны:



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

сціплай, але рашучай на адказныя ўчынкі дзеля сваіх дзяцей; звонку не занадта дужай фізічна, але нястомнай працаўніцай, клапатлівай гаспадыняй, ахоўніцай сям'і. У цэлым, вобраз маці ў гэтых аповесцях шматаспектны, шматсімвалічны, нават сакральны.

## ЛІТАРАТУРА

1. **Бугаёў, Д.** Вобраз маці і ўвогуле жанчыны ў творах Івана Шамякіна / Д. Бугаёў// Роднае слова. 2007. № 1. С. 14–16.

2. **Давыдава, Г.** "Любоў маці мацней за смерць": вобраз жанчыны-маці ў творчасці Івана Шамякіна / Г. Давыдава // Роднае слова. 2006. № 10. С. 45–46.

3. **Давыдоўская, Н.** Вобраз Мадонны ў прозе Івана Шамякіна і Віктара Казько (на матэрыяле аповесцяў "Палеская мадонна" і "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел" / Н. Давыдоўская // Роднае слова. 2007. № 12. С. 29.

4. **Шамякін, І.** Аўтабіяграфія / І. Шамякін // Пяцьдзесят чатыры дарогі: аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. Мінск: Маст. літ., 1963. С. 529.

5. **Шамякін, І.** Палеская мадонна: аповесці / І. Шамякін. Мінск: Юнацтва, 1998. 590 с.

6. **Шамякін, І.** Пошукі прытулку: аповесці / І. Шамякін. Мінск: Юнацтва, 2001. 350 с.